# Партызаны, партызаны, беларускія сыны

**Аб характары і размаху барацьбы беларускіх партызан супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў па просьбе карэспандэнта АДН Анатоля СТУКА расказвае адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Уладзімір Елісеевіч ЛАБАНОК.**

— Першая раніца 1941 года, якую давялося сустракаць нямецкім акупантам у Мінску, нічога не абяцала ім добрага. У гарадскім парку былі знойдзены забітыя афіцэры і салдаты. А ў іншых месцах акупантаў чакалі яшчэ больш ашаламляючыя «сюрпрызы» — арганізаваныя нападзенні на калоны воінскіх часцей, якія рухаліся ў бок фронту, завалы на дарогах, узарваныя масты.

У тых, хто мог трымаць у руках зброю і па волі лёсу застаўся на акупіраванай ворагам тэрыторыі, не ўзнікала пытання «што рабіць?» Сваё месца яны бачылі ў радах байцоў народнага супраціўлення, якое пачало стварацца ўсюды з першых дзён акупацыі Беларускай рэспублікі. Яго арганізатарамі сталі кіраўнікі мясцовых партыйных і савецкіх органаў.

Мне, у прыватнасці, было даручана арганізаваць у падполлі ўзброеную барацьбу з акупантамі ў паўночна-заходняй частцы рэспублікі, дзе я працаваў дырэктарам сельскагаспадарчага тэхнікума, а літаральна напярэдадні вайны быў выбраны сакратаром Лепельскага райкома партыі. Маімі памочнікамі сталі дырэктар машынна-трактарнай станцыі, сельскія актывісты, дэпутаты раённага і сельскіх Саветаў. У добраахвотніках змагацца з ворагам не было недахопу. Партызанскі атрад, які нам удалося стварыць, хутка перарос у брыгаду. У 1943 годзе пад кантролем злучэння, у якое яна ўваходзіла, знаходзілася тэрыторыя, дзе пражывала больш як 100 тысяч чалавек.

Вопыт баявых дзеянняў у час зімовай наступальнай кампаніі 1941—42 года, калі Савецкая Армія паспяхова правяла першае буйное стратэгічнае наступленне пад Масквой, паказаў, што і мы многае можам зрабіць. Асабліва вялікі эфект прыносілі дыверсіі на чыгунцы. На асобных участках, у прыватнасці на чыгуначнай магістралі, якая звязвала Берлін са штабам групы армій «Цэнтр», нам удалося затрымаць рух паяздоў з падмацаваннем на некалькі сутак. Толькі сіламі адных аршанскіх падпольшчыкаў было ўзарвана 100 паравозаў, выведзены са строю чыгуначны вузел Орша.

Само жыццё паставіла на парадак дня пытанне аб аб'яднанні дробных партызанскіх атрадаў у буйныя баявыя фарміраванні, аб цэнтралізацыі ўпраўлення партызанскімі сіламі, без чаго немагчыма было весці шырокамаштабныя і ўзгодненыя баявыя дзеянні. Асноўнай формай аб'яднання атрадаў стала партызанская брыгада, якая налічвала ад адной да дзвюх і больш тысяч чалавек. Каардынацыю баявых дзеянняў партызан на ўсёй акупіраванай

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы